УДК 94(476)

# АСОБА СВЯТАРА Ў ЖЫЦЦІ ХРАМА ПАДЧАС ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ (НА ПРЫКЛАДЗЕ ПЕТРАПАЎЛАЎСКАЙ ЦАРКВЫ Ў АГ. ВЕНЗАВЕЦ)

***У. Ю. Сарачынская***
*курсант 1 курса факультэта міліцыі*
*Магілёўскага інстытута МУС Рэспублікі Беларусь*
*Навуковы кіраўнік:* ***А. Я. Ігнатовіч****,*
*дацэнт кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін*
*Магілёўскага інстытута МУС Рэспублікі Беларусь,*
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт*

Петрапаўлаўская царква ў аг. Вензавец была сведкам многіх падзей, якія адбываліся на тэрыторыі нашай краіны. І Вялікая Айчынная вайна не выключэнне. У гады вайны пастырскую дзейнасць ажыццяўляў святар Аляксандр Мікалаевіч Семашкевіч (быў святаром храма прыкладна да 1955 г.). Аб жыцці і дзейнасці святара Вензавецкай Петрапаўлаўскай царквы можна даведацца па ўспамінах старажылаў вёскі і ўнукаў святара. Мэта даклада — ахарактарызаваць асобу святара ў жыцці храма ў дадзены перыяд.

У гады вайны святар аказваў маральную падтрымку насельніцтву: вёў гутаркі з гаспадарамі двароў, даваў рэкамендацыі, як сябе весці пры сустрэчы з немцамі, якія чытаць малітвы ў цяжкую хвіліну. Акрамя псіхалагічнай падтрымкі, святар дапамагаў і матэрыяльна, аб чым узгадваюць сведкі. Пра дзейнасць Аляксандра Семашкевіча Алена Віктараўна Валанцэвіч узгадвае: «Некалі бацюшка меў зямлю і даваў зямлю людзям, хто хацеў, той рабіў. Яму давалі, як пажнуць збожжа. Колькі давалі, Бог яго ведае». Таксама пра жыццё Аляксандра Семашкевіча змагла ўзгадаць жыхарка аг. Вензавец Зінаіда Уладзіміраўна Шапурка: «Сям'я святара мела шмат козаў, і матушка малако гэтых козаў раздавала ў сем'і, дзе жылі малыя дзеці. Кожны тыдзень бацюшка абходзіў сем'і, у якіх было шмат дзяцей, і цікавіўся, што ім патрэбна. Таксама святар заклікаў сваіх прыхаджан да дапамогі храму, сам браў малаток і рамантаваў храм. Але ў большай ступені рабіў усё самастойна. У гады вайны айцец Аляксандр праяўляў вялікую чалавечнасць. За хрышчэнне, адпяванне ён не браў грошай, а толькі прасіў дапамогі па гаспадарцы». Пра шчырае сэрца святара ўзгадала яго ўнучка, жыхарка вёскі Хадзяўляны Вера Іванаўна Нічыпар: «У гады вайны ў адной сям'і нарадзілася двое дзяцей. Хрышчэнне праводзілі восенню ў царкве. Бацюшка аплату не ўзяў. Яму завезлі шмат збожжа, але ён

гэта збожжа адправіў назад, кажучы: “У вас і так вялікая сям’я, вам есці трэба, а я са сваімі двума дзецьмі і так пражыву”».

Такім чынам, можна зрабіць вывад аб тым, што ў жыхароў аг. Вензавец у гады вайны была надзейная апора, якая натхняла на веру ў лепшае жыццё і Перамогу: падтрымка святара дапамагала мясцовым жыхарам пеpажыць цяжкасці Вялікай Айчыннай вайны.